# Ветэран трох войнаў і двух узброеных канфліктаў

*Герою нашага аповеду, можна сказаць, у жыцці пашанцавала. Памяркуйце самі. Зміцер Данілавіч Мядзелец быў удзельнікам трох войнаў і двух узброеных канфліктаў. Нягледзячы на такі вялікі паслужны спіс, ветэран, які не аднойчы глядзеў смерці ў твар, пазбег смяротных аскепкаў снарадаў і мін, куль і штыкоў.*

Выхадзец з вёскі Страшное (са жніўня 1964-а – Высокі Бераг) Красналукскай воласці Барысаўскага павета з'явіўся на свет у 1915 годзе. Бацькі былі сялянамі, таму Зміцер з маладых гадоў не па чутках ведаў пра штодзённую цяжкую працу вяскоўцаў. У канцы 1920-х, скончыўшы толькі пяць класаў сельскай школы, хлопец быў змушаны пайсці працаваць. Па дасягненні ўзросту 21 год Зміцера прызвалі на ваенную службу ў РККА. Служыць прызначылі ў войскі пераменнага саставу тэрытарыяльных частак Беларускай вайсковай акругі (з 1938 – Беларуская асобая вайсковая акруга, з ліпеня 1940 – Заходняя асобая вайсковая акруга).

Коратка пра гэты від вайсковай службы.

У першы год вайскоўцы пераменнага саставу тэрытарыяльных частак праходзілі трохмесячнае навучанне ў адной з вайсковых частак, да якой прыпісваліся на поўны пяцігадовы тэрмін службы. У наступныя чатыры гады вайскоўцаў прыцягвалі на штогадовыя вучэбныя зборы працягласцю ад двух да пяці месяцаў. Акрамя таго, вайскоўцы пераменнага саставу маглі прыцягвацца камандзірамі да кароткатэрміновых вучэбных збораў, а таксама да выканання асобных вайсковых даручэнняў і заданняў без адрыву ад месца жыхарства і заняткаў. У астатні час службы такія байцы знаходзіліся ў адпачынку, гэта значыць былі па месцы прапіскі. У выпадку, калі воінская частка прыцягвалася Наркаматам абароны для выканання якіх-небудзь задач, то вайскоўцы пераменнага складу адклікаліся з адпачынку, застаючыся ў воінскай частцы да адмысловага распараджэння.

Не дзіўна, што чырвонаармеец Мядзелец прыняў баявое хрышчэнне задоўга да 1941 года. У другой палове 1930-х свет ушчыльную наблізіўся да парога чарговай вялікай вайны. Неспакойна было і на межах СССР. У 1936-м японскі ўрад падпісаў "Антыкамінтэрнаўскі пакт", які аформіў саюз з нацысцкай Германіяй. У 1938/39 гадах Японія здзейсніла шэраг правакацый на межах СССР і Манголіі. У канцы чэрвеня 1938 года часткі Квантунскай арміі ініцыіравалі ўзброены канфлікт супраць савецкіх войскаў Далёкаўсходняга фронту ў раёне возера Хасан. Лютыя баявыя дзеянні завяршыліся 11 жніўня разгромам японскай групоўкі. У перамогу над агрэсарам унёс свой уклад і Зміцер Мядзелец.

Годам пазней ён прыняў удзел у вызваленчым паходзе войскаў РККА у Заходнюю Беларусь, а праз некалькі месяцаў ужо ваяваў з фінамі на Карэльскім перашыйку. Пасля савецка-фінскай вайны (1939-1940) вярнуўся на радзіму. Вярнуўся пасталелым, узмужалым маральна і фізічна, таму маладога чалавека не спалохала цяжкая і небяспечная праца лесасека ў Барысаўскім леспрамгасе. Год мірнага жыцця праляцеў хутка...

З пачаткам нямецкага ўварвання ў СССР Зміцер Данілавіч атрымаў позву з Халопеніцкага райваенкамата (з 1924 па 1959 г. вёска адносілася да Халопеніцкага раёна, а пасля яго скасавання – да Барысаўскага раёна) з'явіцца на зборны пункт. Тым часам у хаосе першых дзён вайны патрапіць у дзейсную армію Мядзельцу і яго аднавяскоўцам не ўдалося: з прычыны імклівага наступу нямецкіх войскаў фронт адсунуўся на дзясяткі кіламетраў да ўсходу. Апынуўшыся ў нямецкім тыле, мабілізаваныя вярнуліся дадому. У цяжкі перыяд акупацыі Зміцер Данілавіч жыў з бацькамі ў вёсцы, дапамагаючы весці гаспадарку. З развіццём партызанскага руху стаў сувязным партызанскай брыгады імя С.М.Кірава.

З вызваленнем Барысаўшчыны ад нямецкіх акупантаў вясковец ізноў атрымаў мабілізацыйную позву. Месяц у палкавой "вучэбцы", і ў жніўні 1944 чырвонаармеец Мядзелец адбыў на 3-і Беларускі фронт. Служыў і ваяваў ва ўзводзе хімабароны 1233-а стралковага палка 371-й стралковай дывізіі (65-ы корпус, 5-я армія), воіны якой у канцы чэрвеня – на пачатку ліпеня 1944 года вызвалялі Барысаўшчыну паўднёвей возера Пялік.

Да першай сваёй узнагароды – медаля "За ўзяцце Кёнігсберга" яфрэйтар Мядзелец быў прадстаўлены за ўзяцце Кёнігсберга (цяпер Калінінград). Камандаванне Вермахта лічыла сталіцу Усходняй Прусіі непрыступнай крэпасцю.



Тым не менш савецкім войскам спатрэбілася ўсяго чатыры дні, каб авалодаць цытадэллю. У перыяд Кёнігсбергскай аперацыі (6-10 красавіка 1945 года) супраціў ворага быў зламаны і горад здаўся на літасць пераможцаў.

Другой узнагароды – медаля "За адвагу" Зміцер Данілавіч быў удастоены за ўдзел у Земландскай наступальнай аперацыі (13-25 красавіка 1945 года). У баі 11 красавіка стралок узвода хімабароны Мядзелец, "абышоўшы ўмела агнявую кропку ворага з фланга,... гранатамі вывеў са строю кулямётны разлік..., чым дапамог авалодаць вышынёй 62,4".

На зыходзе вайны злучэнні 5-й арміі вывелі ў рэзерв Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання. З завяршэннем Вялікай Айчыннай вайны на еўрапейскім кантыненце, Другая сусветная вайна не скончылася: СССР, выконваючы саюзныя абавязанні, пачаў падрыхтоўку да вайсковых дзеянняў на Далёкім Усходзе.

Воінам-пераможцам, у якіх наперадзе была чарговая вайна, Стаўка зрабіла сапраўды царскі падарунак – двухдзённы прыпынак у Маскве. Менавіта ў сталіцы Савецкага Саюза, а не дзесьці на чужыне, Зміцеру Данілавічу пашчасціла сустрэць 9 траўня доўгачаканую Перамогу.

Не думаў, не гадаў салдат, што праз сем год яму прыйдзецца ізноў ваяваць з японцамі. Па прыбыцці да ўсходніх межаў, войскі 5-й арміі ўвайшлі ў склад Прыморскай групы войскаў, пераўтворанай 5 жніўня 1945 года ў 1-ы Далёкаўсходні фронт. 9 жніўня пачалася Маньчжурская стратэгічная наступальная аперацыя, якая абвясціла вайну Японіі. За 23 дні баявых дзеянняў савецкія войскі зрабілі зруйнавальны ўдар па Квантунскай арміі, які стаў адным з вызначальных фактараў разгрому Краіны Узыходзячага Сонца. За баі ў Маньчжурыі камандзір конна-дэгазацыйнай павозкі ўзвода хімабароны 1233-а стралковага Віцебскага палка, сяржант Зміцер Мядзелец быў узнагароджаны медалямі "За баявыя заслугі" і "За перамогу над Японіяй".

Толькі летам 1946-а салдат вярнуўся ў родны край. Працаваў будаўніком у мясцовым калгасе. За трыццаць з лішнім гадоў брыгадзір будаўнічай брыгады Мядзелец узвёў мноства розных будынкаў і збудаванняў. Вясковец не пакінуў працу і пасля выхаду на заслужаны адпачынак. На жаль, атрымаць у 1985-м ордэн Айчыннай вайны ветэрану трох войнаў было не наканавана.

***Аляксандр Балябін,***
***гісторык-археограф ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева"***